# Дыярыуш як стыль жыцця і творчасці



Лаканічна творчасць Ніны Маргаевай можна ахарактарызаваць як творчасць актыўнага дзеяння, расповеда і дынамічных вобразаў. Мастачка — мінчанка, яна нарадзілася ў 1984 годзе, а ў 2007 скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «народныя рамёствы» і спецыялізацыі «кераміка». Цяпер кіруе гуртком малявання ў Цэнтры мастацкай творчасці Фрунзенскага раёна г. Мінска.





Задоўга да свайго навучання ва універсітэце — з 1997 г. — Ніна Маргаева прымала актыўны ўдзел у сумесных мастацкіх выставах. Апошнім часам мастачка рэалізуе па некалькі праектаў штогод. Сярод іх шматлікія выставы ва універсітэце культуры, удзел у міжнародных выставах і мастацкіх пленэрах. Гэта і «Арт-сесія» (2004, 2005), і «Шляхамі Напалеона Орды» (2007), і «Успамін пра Дабраўляны» (2008), прысвечаны К. Бахматовічу... У 2007 г. адбылася персанальная выстава маладой мастачкі ў філіяле Беларускага дзяржаўнага мастацкага музея «Дом-музей Ваньковічаў».



Толькі пералік дасягненняў Ніны Маргаевай можа займаць аб'ём агляднага артыкула. Спынімся падрабязней на апошнім праекце



«Дыярыуш», здзейсненым сумесна з Верай Каўзановіч на пачатку восені 2008 г. у мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Тая знакавая выстава стала вынікам працяглых спроб і пошукаў — амаль усе прадстаўленыя работы Ніны Маргаевай датаваліся 2008 годам.

«Дыярыуш» — не толькі выстава ў вузкім сэнсе слова, але і своеасаблівы мастацкі праект. Праект, які пачынаецца з відавочнага, надзвычай вартаснага выбудоўвання выставачнага інтэр'ера. У цэнтры залы была змешчана інсталяцыя з яблыкаў і дзённікавых аркушаў дзвюх аўтарак. Прычым творы мастачак «кантактавалі» паміж сабою ў прынцыпова падзеленай напалам прасторы. Напрыканцы выставы мастачкі стварылі хэпенінг: запрасілі частавацца яблыкамі. А каб падкрэсліць умоўнае творчае сталенне, да зялёных яблыкаў дадаліся чырвоныя.



Кожны твор Ніны Маргаевай — своеасаблівая мастацкая старонка яе дзейснага дзённіка. Так, у «Мосце» скіраваныя на гледача позіркі мужчыны і жанчыны ствараюць унутраную адлегласць, а ў «Дыялогу» героі засяроджаны выключна адзін на адным.

У аркушах «Сыход» і «Дзявочыя мары» паказаны ўласны свет мастачкі як вынік знешніх абставін і існавання. Затое «Пострыг у эмігран-





ты» — «сыход» аўтаркі з «дзявочых мар», але «сыход» не як вынік, а як абставіны. На нас дыяганальна, быццам адным мантажным кадрам трэвелінгу кінакамеры — пэндзля мастачкі — насоўваюцца неверагодныя постаці. Магчыма, гэта «сыход» з «дзявочых мар» у нязведанае дарослае жыццё. Таму, пры аб'яднанні трох апошніх работ ва ўмоўны «трыпціх», «Пострыг...» я б паставіў на цэнтральнае месца. «Цені ў выраі» — працяг «Пострыгу...», тут валасы гераіні становяцца ценямі навакольных постацяў.

Творчасць маладой мастачкі адлюстравана не толькі графікай, але таксама і керамікай. Дзве плыні як плоскасныя і аб'ёмныя мастацкія вобразы ўзаемадапаўняюць адна адну. Прынамсі, графічная работа «Нямыя сведкі», выкананая ў змешанай тэхніцы — чарговы этап пошукаў вобраза рыбіны. І на аркушы, і на керамічнай кампазіцыі «Сутнасць рыбы (Нямыя сведкі)» паказаны свет нямых істот, што вядуць свой дыялог-дыярыуш паміж сабою. Дзве рыбіны на кожным з твораў — адлюстраванне знешняга падабенства і ўнутранага канфлікту. Яны нібыта людзі-блізняты, якія памылкова падаюцца тоеснымі толькі пры першым знаёмстве, калі мы яшчэ не паспелі вывучыць унутраную сутнасць кожнага з іх.









Большасць прац аўтаркі ў тэхніцы керамікі ўяўляюць сабою шматфігурныя кампазіцыі, што адлюстроўваюць гармонію супрацьлегласцей і змагання. Сярод такіх работ, бадай, найбольш паказальнай з'яўляецца кампазіцыя «Натуральны адбор» (2004). Аднафігурныя ж керамічныя творы вельмі часта аб'ядноўваюцца ў серыі, у прыватнасці, серыя «Рыбы іншай планеты» (2004).

Дыярыуш, вынесены ў загаловак чарговай выставы, стаў дыялогам дзвюх аўтарак паміж сабою, дыялогам з уласным светам і з гледачом. Дыярыуш — своеасаблівы сродак, эфект і стыль творчасці Ніны Маргаевай. Дыярыуш — разважанне, аповед, адкрыццё, раскрыццё, споведзь, а, магчыма, і выклік — можна працягваць бясконца...

Працы мастачкі можна ўбачыць у сеціве на http://rehaart.narod.ru

Адам ШОСТАК







